Р 609

Родное слова

7
2012
ISSN 0234-1360

- **Інтэрв'ю з Віктарам Іўчанкавым**
"Слова стала самым дарагім каштоўным прадуктам..."
- **Матэрыялы рэспубліканскай алімпіяды**
Трэці этап.
2011/2012 навучальны год. IX клас
- **Святлана Зміеўская**
"Абараняючы родную зямлю": Літаратурна-музычная кампазіцыя
- **Фаіна Ваданосава**
Янка Купала і кніга

штомесячны навуковы і метадычны часопіс

Помнікі беларускага пісьменства

ГРАФІКА-АРФАГРАФІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ КНІГ "РУФ" І "СУДДЗІ" ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

Аналізуюцца вынасныя літары і надрадковыя знакі, графемы для перадачы галосных гукаў у адзначаных выданнях Францыска Скарыны.

Ключавыя словы: *старадрукі Францыска Скарыны, дыякрытычныя знакі, вынасныя літары, графема, паўустаў.*

There were analysed superscript letters and diacritical marks, graphemes for reproducing vowel sounds in designated editions of Frantsysk Scaryna.

Графічная сістэма любога тэксту непасрэдна адлюстроўвае моўную сітуацыю, якая панавала ў пэўны прамежак часу. Для нас вельмі важна акрэсліць усе магчымыя графіка-арфаграфічныя асаблівасці друкаваных кніг Старога Запавету і прасачыць іх навуковае абгрунтаванне ў спецыяльнай літаратуры.

Як вядома, выданне Францыскам Скарынам кніг Старога Запавету ажыццяўлялася кірылічным шрыфтам. Яўхім Карскі ў працы "Беларусы" звярнуў увагу на знешняе афармленне пражскіх старадрукаў і ахарактарызаваў іх наступным чынам: "Полууставному письму подражают шрифты старопечатных западнорусских книг. Древнейшие издания – это Библия Скорины. Как можно видеть из прилагаемых снимков, в шрифте Скорины основные линии выведены прямо вертикально, вследствие чего в общем буквы производят впечатление устава. Иллюзия, конечно, нарушится, если мы присмотримся к отдельным начертаниям. Тут мы заметим немало новизны. Так, его буквы *к, в, т, е, з* выводятся только из полуустава, откуда же и его *в* с особенно маленькой головкой и *а*, похожее на *я*; особые вычурные *ч, ж, ю, т* – изобретение самого Скорины" [2, с. 73]. Я. Карскі вызначыў характар шрыфту як малодшы паўустаў, акцэнтуючы ўвагу на асаблівасці адлюстравання некаторых літар.

ДЫЯКРЫТЫЧНЫЯ (НЯЛІТАРНЫЯ) ЗНАКІ

Для кніг Старога Запавету характэрна шырокае выкарыстанне разгалінаванай сістэмы надрадковых знакаў. Пытанне апраўданасці ўжывання гэтых знакаў для славянскіх тэкстаў ставілася ў многіх працах рускіх і беларускіх даследчыкаў мовы, але, як і для большасці гістарычна аддаленых моўных задач, аксіёмы не існуе. Дыякрытычныя знакі першапачаткова былі запазычаны з грэчаскай мовы, дзе яны адрознівалі доўгія і кароткія галосныя, а таксама абазначалі розныя тыпы націску – востры, аблегчаны, цяжкі. Гэтыя знакі маглі быць надрадковыя, падрадковыя, унутрырадковыя. У выданнях Ф. Скарыны выкарыстоўваюцца толькі надрадковыя знакі, якія раней называліся "вымолвные письмена" [5, с. 671], бо знакі націску і прыдыхання павінны былі ўказваць на вымаўленне тых ці іншых слоў. Гаворка пра непасрэднае і практычнае іх выкарыстанне ў старажытных тэкстах заўсёды носіць гіпатэтычны характар. Як адзначаў яшчэ Я. Карскі, у найбольш ранніх тэкстах колькасць гэтых знакаў была вельмі нязначная і толькі з XIV – XV стст. пачало пашырацца іх моўнае выкарыстанне [3, с. 229]. Гэта найперш звязваюць з другім паўднёваславянскім уплывам з боку графікі: «Мы уже указывали, что в 14 в. на юге славянства были выработаны искусственные правила постановки придыханий и ударений. Иначе и поступить было нельзя. Раз было в обычае употребление надстрочных знаков, то надо было его как-нибудь упорядочить: письмо "развращённое" было нетерпимо. Эта реформа произошла в Болгарии при Евфимии Тырновском, а в Сербии пропагандировалась последователем Евфимия – Константином Костенеческим. Мнения Константина Костенеческого служили предметом внимания у разных последующих книжников; подвергались изменениям и дополнениям, но, во всяком случае, не были забыты, а развивались ещё в больших подробностях, так что, читая какую-либо рукопись 16 в., не можем даже понять, чем руководствовались писцы в постановке тех или других надстрочных знаков» [3, с. 230]. Адносна сістэмна (але без прычынна-выніковых сувязей) алгарытм выкарыстання на пісьме надрадковых знакаў і іх гісторыя пададзены ў працы "Рассуждения южнославянской и русской старины о церковно-славянском языке" (звод розных артыкулаў з грэчаскіх крыніц, перапрацаваных пад уплывам тагачаснай моўнай практыкі) І. Ягіча [4].

У тэкстах кніг "Руф" і "Суддзі" Ф. Скарына выкарыстаў наступную сістэму надрадковых знакаў, якія, дарэчы, адліваліся разам з літарамі:

1) "оксия, окс, оксь, острая" (´). Гэты надрадковы знак ужываўся Скарынам над літарай *е* ў канцы слова: *дниé очищениѧ, насмирениé, двоé*;

2) "вария, тяжкая" (`). Асаблівасць выкарыстання менавіта гэтага знака заключаецца ў яго непаслядоўнасці, але найчасцей ён ставіўся

ў канцы слова над *и* (асабліва ў значэнні *й*): *всеѝ, малоѝ, з великоѝ, превечныѝ*;

3) "исо, исть, иссо" (^{s}). Характар ужывання гэтага нялітарнага знака вызначаецца фармальнымі паказчыкамі: ён выкарыстоўваецца больш паслядоўна над злучнікамі *а*, *и*, а таксама над лігатурай ѿ: *И^{s} ангелъ, ѿ^{s} очию его, Гедео^{s}нъ, о^{s}пустилъ*;

4) "ерик, ерок, ерчик, ертица, паерк, паерок" (^{s}). У розных кнігах гэты знак сігналізаваў пра наяўнасць цвёрдага рэдукаванага і цвёрдасць зычнага ў сярэдзіне і канцы слова. У адрозненне ад іншых надрадковых знакаў для выкарыстання ерыка характэрна выразная паслядоўнасць: *съкожным^{s}, судом^{s}, роз^{s}билъ, напол^{s}нилъ*;

5) цітла (˜). Пад цітлай пісалася адна з прапушчаных літар, калі слова перадавалася ў скарочаным выглядзе; літарамі з цітлам над імі абазначаліся лікі. Гэты знак паслядоўна выкарыстоўваецца не для ўсіх слоў, а толькі для сакралізацыі некаторых царкоўных паняццяў: *гд҃ь, гд҃нь, мил҃сти, гл҃юще, бг҃ъ* і інш. Але трэба адзначыць, што цітла не заўсёды ўказвала на скарачэнне слова і вынясенне літары над радком. У рускіх друкаваных тэкстах пад цітлай (каморай) пісаліся аднаскладовыя словы (с҃а, м҃а), якія атрымалі назву "супружие" [4, с. 794].

Дыякрытычныя знакі – важны складнік графічнай сістэмы тэкстаў, які, магчыма, і загрувашчвае моўную аснову, стварае пэўныя перашкоды для чытання пісьмовага матэрыялу, але ўжо на падставе механічнай пераемнасці гэты фармальны паказчык яднае друкаваныя тэксты Ф. Скарыны з пісьмовай традыцыяй. Лічым, аднак, што гэта была не самамэта першадрукара.

ВЫНАСНЫЯ ЛІТАРЫ

Акрамя дыякрытычных знакаў своеасаблівасць графічнай сістэмы друкаваных кніг "Руф" і "Суддзі" заключаецца ў значнай колькасці вынасных літар, арыентуючыся на якія Я. Карскі вызначыў тып скарынаўскага шрыфту як малодшы паўустаў. Чым іх больш, тым пісьмо паскараецца, знешні выгляд літар можа кардынальна змяніцца. З распаўсюджваннем скорапісу рукапісны тэкст становіцца цяжка пазнавальным, абрысы графем трансфармуюцца і іх канфігурацыя вызначаецца ўрыўкавасцю. Друкаваны тэкст, безумоўна, арыентаваўся на рукапісныя аналагі таго ж часу, акрамя таго, тут жа спрацоўваў прынцып эканоміі пісьмовай прасторы. Улічваючы, што друкаваныя кнігі на той час яшчэ былі прадметам раскошы, то зразумела, што як мага меншы аб'ём павінен быў утрымліваць як мага больш зместу. Зусім натуральна тады выглядае выкарыстанне вынасных літар, што з'яўляліся толькі ў абсалютна зразумелых словах, якія не патрабавалі нейкага дадатковага каментарыя. Літара магла выносіцца над радком у сярэдзіне слова (першая літара, якая стаіць за галоснай), у канцы слова. У скарынаўскім тэксце выносяцца наступныя літары:

1) у дзеясловах 3-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу – літара *т*: *побирае^{т}, выиде^{т}, погледи^{т}* і інш.; вельмі часта сустракаецца лігатура *е^{ст}*, канфігурацыя якой вызначаецца шматузроўневасцю;

2) у сярэдзіне і канцы слова – літара *н*: *Ева^{н}гелистъ, гора Сио^{н}, сы^{н}ми, Хелио^{н}*;

3) літара *м*: *докторо^{м}, посполиты^{м}*;

4) літара *с*: *мило^{с}ти, го^{с}подь*;

5) літара *х*: *и^{х}, убоги^{х}, ваши^{х}, избави^{х}, пони^{х}*;

6) літара *д*: *вла^{д}ыку, пре^{д}очима*;

7) літара *о*: *про^{о}рка.*

Неабходна адзначыць, што вынясенне літары над радком сведчыла пра эканомію і было адным са складнікаў індывідуальнага аўтарскага стылю, бо, як адзначаюць вучоныя, некаторыя вынасныя літары (*м*, *н*), выкарыстаныя ў друкаваных кнігах Старога Запавету Ф. Скарынам, не маюць аналагаў сярод іншых кніг і папярэдняя распрацоўка канфігурацыі вынасных элементаў вылучаецца выразным уласнатворчым характарам. Усе тыя графічныя элементы, якія не маюць непасрэднага дачынення да мовы пісьмовага помніка, адлюстроўваюць ці то блізкасць да традыцыі, ці мэтазгоднасць іх мастацкага ўвасаблення, але менавіта для надрадковых знакаў і вынасных літар у дадзеным моўным кантэксце характэрна трывалая прасторавая пазіцыя. Як адзначалася вышэй, пэўны алгарытм, нейкую заканамернасць для дадзеных графічных элементаў у вызначаных тэкстах выявіць, напэўна, немагчыма, бо адбываецца паступовая іх дыферэнцыяцыя ў залежнасці ад практычнага іх прымянення. І гэта яшчэ адна з падстаў меркаваць пра набліжэнне кніжнай мовы да гутарковай, здыманне нейкіх штучных бар'ераў, якія ўскладнялі чытанне і разуменне любых тэкстаў.

ГРАФЕМЫ ДЛЯ АБАЗНАЧЭННЯ ГАЛОСНЫХ ГУКАЎ

Наяўнасць некалькіх варыянтаў для адной графемы абумоўлена яе пазіцыяй у дачыненні да іншых графем, а таксама ўжо адразу можна сказаць пра неадпаведнае выкарыстанне некаторых графем, іх узаемнае змяшэнне і ўзаемадапаўненне. Разналітарнае напісанне ўласціва многім галосным графемам, і гэта звязана з рознымі фактарамі.

1. У тэксце адбываецца выразнае размежаванне графем *е* і *є*. Наяўнасць графічнага знака *е* сведчыць пра памякчонасць складу, яго выкарыстанне больш шырокае: *воевахсѧ, поведелъ, пребывати* і інш. Є выкарыстоўваецца ў тэкс-

це толькі для перадачы спалучэння [jэ] і ніколі не пачынае слова: *разноличыє, сеє егда доконалъ, единостаиноє, загинутиє, поглавиє, людиє, милосердиє божиє* і інш. Дакладна зразумела, што характар гучання, як і выкарыстання, у гэтых словах адрозніваецца. Акрамя таго, для абазначэння гука [э] ўжываецца ѣ. Гісторыя гэтай графемы вызначаецца вялікай часавай працягласцю, калісьці гэта была асобная і самастойная фанема, яна выразна адрознівалася ад *е* і *є*. У славянскіх мовах яна праявілася па-рознаму ў залежнасці ад іх фанетычных асаблівасцей. У старабеларускай мове яна вызначалася высокім пад'ёмам і гучала сярэдне паміж *е* і *я*, але з часам часткова або поўнасцю супала з галосным пярэдняга раду [э]. Атрымалася, што ў выніку канвергенцыі адбылося змяшэнне ѣ і *е*, гэты ж працэс адлюстраваны ў тэксце: *предословие, конецъ, хлебъ, поколение, отець* і інш. Пра неадрозненне гэтых дзвюх літар сведчыць таксама іх дублетнае выкарыстанне: *предословие – прѣдъсловиѧ, поколение – с поколѣниѧ, конецъ – конѣцъ* і інш.

2. Для абазначэння гука [а] таксама выкарыстоўваецца некалькі варыянтаў: *а*, ꙗ, ѧ.

Апошнія два варыянты абазначаюць гук [а] пасля мяккага. Трэба адзначыць, што варыянты ꙗ і ѧ ўзаемазамяняюцца нават у адных і тых жа пазіцыях: *ꙗчмень – ѧчмень, рукоꙗть – рукоѧть, царꙗ – царѧ, приꙗтель – приѧтель, судьꙗми – судьѧ* і інш. Галосная графема ѧ ў старабеларускіх тэкстах мае вельмі штучны характар, калі ўлічваць, што існуе аналаг ꙗ, але гэта быў адзін са спосабаў перадачы гука [а] пасля мяккіх зычных: *ездѧѱихъ, кнѧжаѱихъ, протѧгни, валѧлсѧ, колъ вѧзѧѱъ* і інш. Акрамя таго, мы знайшлі словы *каꙗхусѧ – покаѧниѧ – покаѧние*, другое з якіх вызначаецца як гіпернорма. Увогуле прынцыпы выкарыстання розных варыянтаў літары *а* адпавядаюць іх пазіцыі ў слове, пытанні могуць узнікнуць з ѧ і ꙗ, для якіх няма выразнага размежавання.

3. Для абазначэння гука [і] у тэксце існуе некалькі варыянтаў: *ї, и́, и*. Літара *и* (дзесяцярычнае) пішацца для абазначэння гука [і] пасля мяккага зычнага: *ѿворилъ, ꙋчинилъ, попалиша, единороженнаѧ* і г. д. Графема *ї* выступае ў тэксце як арфаграфічны варыянт *и*, але вызначаецца характарам ужывання: яна выкарыстоўваецца найчасцей ва ўласных назвах і зрэдку перад ётаванымі галоснымі: *всих созженїѧ, возлианїѧ, Оїюде, за Їорданомъ, Їзахарово, Їзегипта, Їзраилевыхъ* і г. д. З надрадковым знакам "ісо" таксама пішацца *и* дзесяцярычнае, калі абазначае злучнік: *Йпоодаль живуѱе, Й ѿтоле идоша, Й Їдолы ꙋчинити, Йпоставиша, Й внидоша* і г. д. Сярод усіх гэтых формаў пераважае *и* дзесяцярычнае.

4. Найбольшай паслядоўнасцю вылучаецца гук [ы]. Няўстойлівасць *ы* ў сістэме фаналагічных супрацьпастаўленняў прывяла да таго, што *ы* фаналагічна супаў з *и*. У сучаснай беларускай мове яны захоўваюцца як гукі, але з'яўляюцца пазіцыйнымі варыянтамі адной фанемы. Калі звярнуцца да гісторыі, то *ы, і* былі пазіцыйнымі разнавіднасцямі *ь* і *ъ*. Іх функцыянаванне адбывалася ў выніку ўплыву j, а таксама галосных верхняга пад'ёму. У друкаваным тэксце скарынаўскіх кніг графема *ы* ўжываецца пасля цвёрдых зычных і не пачынае слова: *филистымскихъ, жены, тысеѱу, выгнастемѧ* і г. д. Таксама выкарыстанне гэтай графемы ў пэўных пазіцыях сведчыць пра набліжэнне да гутарковай мовы, напрыклад: *съ однымъ полкомъ, многымъ, розыидошесѧ, изыиде, с ыными подругами, куды* і г. д.

5. Для абазначэння гука [у] выкарыстоўваюцца наступныя варыянты: *ꙋ, у, ю, оу*. Графема *ю* выкарыстоўваецца для абазначэння гука [у] пасля мяккага зычнага, рэгулярна яна ўжываецца і пасля галосных: *единою ѱекою ословою, предъ тварию, любить* і г. д. Не адрозніваюцца характарам выкарыстання графемы *ꙋ* і *оу*: яны гэтак жа свабодна пішуцца замест прыстаўкі *в*, прыназоўніка *в*, а таксама пачынаюць слова: *оузяла колъ, ꙋтекаху к вапне, чемꙋ, ꙋздыхала, куды ꙋвоити, оусходити, ꙋзѧлъ сребреники, ꙋ вратъ, ꙋтрее, ꙋвоиѱе, оу Їордана, во оуста* і г. д. Фактычна яны ў плане выкарыстання – дублеты. Калі параўноўваць абрысы літары *у* ў розных відах пісьма – устаў, паўустаў, скорапіс (на матэрыяле табліц, што прапанаваў Л. Чарапнін), то відавочна, што больш пашыраны варыянт *у* характэрны для ўстаўнога пісьма XI ст. Пачынаючы з XII, XIII стст. больш распаўсюджаны варыянты *оу, ꙋ*. Для паўустава толькі з XV ст. зноў пачынае дамінаваць графема *у*. У скарынаўскім тэксце, нягледзячы на пэўную пашыранасць выкарыстання графемы *ук* (*ꙋ*) і дыграфа *оу*, дамінуе варыянт *у*.

6. Для абазначэння гука [о] існуе некалькі варыянтаў: О, о, ѿ. Дыграф ѿ найбольш паслядоўна выкарыстоўваецца для спалучэння [от] у прыназоўніках, каранях і прыстаўках: *ѿпочинутиє, ѿступованиє, ѿрабынь, ѿочию его, ѿвеѱа, ѿМадиамлѧнъ, ѿворилъ* і г. д. Спецыфічнае графічнае адлюстраванне мае літара *о* ў наступных спалучэннях: *ОВениамина, Онъ, Омужех* і г. д. Гэтая спецыфічнасць заключаецца не толькі ў выкарыстанні надрадковага знака "ісо", але і ў канфігурацыі самой літары. Што ж датычыцца рукапісных характарыстык устаўнога і паўустаўнога пісьма, то відавочных аналагаў няма. Як відаць, самым распаўсюджаным варыянтам з'яўляецца графема *о*, якая свабодна выкарыстоўваецца ў пачатку, сярэдзіне і канцы

слова: *отрокъ, близко, небоитесѧ, ѿпоколениѧ* і г. д. Характэрна таксама выкарыстанне на месцы этымалагічнага *е* графемы *о* ў словах тыпу *знашолъ, вышолъ, шолъ*, што звязана з зацвярдзеннем шыпячых. Аднак прыклады можна прывесці толькі з літарай *ш*. Мы не сустрэлі ніводнага прыкладу з зацвярдзелым *ч*, ён заўсёды мяккі: *чюждихъ странъ, так...чили ни, ꙋчителѧ, наꙋчение, не чините* і г. д.

7. Графемы *ь, ъ*. Рэдукаваныя галосныя ўжо чатыры стагоддзі як не абазначалі ніякіх гукаў і пісаліся па традыцыі згодна з законам (тэндэнцыяй) да ўзыходнай гучнасці, паводле якой склады павінны былі быць адкрытымі. Звышкароткія рэдукаваныя да XI ст. абазначалі галосныя гукі, але з часам іх звышкароткасць прывяла да іх падзення (у помніках XI ст. яны ўжо дакладна не размяжоўваюцца і ўзаемазамяшчаюцца). У нашым тэксце таксама няма дакладнага іх размежавання, але варта вылучыць некаторыя асаблівасці іх выкарыстання:

– літара *ъ* нішацца ў дзеясловах прошлага часу: *учинилъ естъ, взѧлъ, навѧзалъ, хотелъ, загадалъ есь* і г. д.;

– у лічэбніках з губнымі зычнымі: *седмъдесѧтъ мужевъ, седмъ, осмъдесѧтъ лѣтъ, четыреста осмдесѧтъ и четыре лѣта* і г. д.;

– літара *ъ* нішацца для абазначэння цвёрдых зычных у канчатках і каранях слова: *складъ, дѵеръ, мозгъ, зажегъше, возъпити, розъбилъ, надъними* і г. д.

Можна вылучыць асаблівасці выкарыстання мяккага рэдукаванага *ь*:

– у дзеясловах цяперашняга часу, а таксама ў формах загаднага ладу: *зрѧть, ослепѧють, да идуть и привезуть, дасть, судѧть, встань и подьмы в путь* і г. д.;

– у лічэбніках: *десеть, лѣтъ пѧть сотъ и двадесеть, четь сыновъ* і г. д.;

– у сярэдзіне і канцы назоўнікаў: *мечь, помоѵь, людьские, Веньаминова, ангельское, кричьте* і г. д.

Такім чынам, сістэма галосных графем для друкаваных скарынаўскіх кніг вызначаецца, з аднаго боку, традыцыйнасцю, а з другога – інавацыйнасцю: пашыраецца фанетызацыя пісьма, праўда, яшчэ не так паслядоўна. Штучныя моўныя напластаванні ў выглядзе некаторых дыякрытычных знакаў, а таксама пэўных галосных (ѧ, ѫ, ѣ, ъ, ь) паступова выцясняюцца і набываюць выразны архаічны характар.

Спіс літаратуры

1. **Біблія** : факсімільнае ўзнаўленне Бібліі, выдадзенай Францыскам Скарынаю ў 1517 – 1519 гг. : у 3 т. – Мінск, 1991. – Т. 2.

2. **Карский, Е. Ф.** Белорусы : в 3 т. / Е. Ф. Карский. – Т. 2 : Язык белорусского наречия. – Вып. 1 : Исторический очерк звуков белорусского наречия – Минск, 2006.

3. **Карский, Е. Ф.** Славянская кирилловская палеография / Е. Ф. Карский. – М., 1921.

4. **Ягич, И. В.** Рассуждения южнославянской и русской старины о церковнославянском языке / И. В. Ягич // Исследования по русскому языку. – СПб., 1885 – 1895. – Т. 1.

Крысціна ВАРОНЬКА,
выпускніца філалагічнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

КАЛЯНДАР ПАМЯТНЫХ ДАТАЎ І ЮБІЛЕЙНЫХ ДЗЁН на 2012 год

ВЕРАСЕНЬ

3 верасня – 85 гадоў з дня нараджэння Алеся Адамовіча (1927 – 1994), празаіка, крытыка, літаратуразнаўцы, сцэнарыста, грамадскага дзеяча

85 гадоў з дня нараджэння Анатоля Сульянава, рускамоўнага празаіка, заслужанага работніка культуры Беларусі

4 верасня – 80 гадоў з дня нараджэння Святланы Нартавай (1932 – 2008), майстра дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва

80 гадоў з дня нараджэння Святланы Яўсеевай, рускамоўнай паэткі, перакладчыка, крытыка

75 гадоў з дня нараджэння Валерыя Шэіна, гісторыка журналістыкі

6 верасня – 220 гадоў з дня нараджэння Івана Грыгаровіча (1792 – 1852), гісторыка, археографа, краязнаўцы, мовазнаўцы

105 гадоў з дня нараджэння Леаніда Рахленкі (1907 – 1986), акцёра, рэжысёра, народнага артыста Беларусі, народнага артыста СССР

75 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Зубарава (1937 – 1988), майстра ў галіне мастацкай апрацоўкі металу

8 верасня – 105 гадоў з дня нараджэння Ісідара Балоціна (сапр. Ізраіль Балотны; 1907 – 1961), спевака, народнага артыста Беларусі

90 гадоў з дня нараджэння Альгерда Малішэўскага (1922 – 1989), жывапісца, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі

10 верасня – 105 гадоў з дня нараджэння Сяргея Сплашнова (1907 – 1979), кінарэжысёра, кінасцэнарыста, кінаакцёра, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі

100 гадоў з дня нараджэння Акіма Курачкіна (1912 – 2004), скульптара, заслужанага работніка культуры Беларусі

75 гадоў з дня нараджэння Марыі Ягоравай (1937 – 2007), мастака-акварэліста

70 гадоў з дня нараджэння Рыгора Яўсеева (1942 – 2004), паэта, крытыка, перакладчыка

13 верасня – 75 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Содаля, літаратуразнаўцы, краязнаўцы

14 верасня – 80 гадоў з дня нараджэння Алы Замай, жывапісца

Працяг на с. 55, 79.